УДК 811.161.3’271

**Месца беларускай мовы ў аксіялагічнай сістэме студэнтаў ФТКГ**

Будзько І.У.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

На працягу 2010-11 навучальнага гадоў кафедра беларускай і рускай моў правяла сацыялінгвістычнае апытанне студэнтаў БНТУ з мэтай вызначэння месца беларускай мовы ў аксіялагічнай сістэме навучэнцаў універсітэта. У апытанні прынялі ўдзел і студэнты ФТКГ, адзінага факультэта ў складзе ўніверсітэта, які мае гуманітарны складнік у сістэме навучання. У апытанні з названага факультэта прыняў удзел 201 студэнт з 13 вучэбных груп, з іх 32,3% рэспандэнтаў мужчынскага полу і 67,7% жаночага. Большасць рэспандэнтаў – 95,5% вызначаюць сябе як беларусы, у апытанні прынялі ўдзел 3% рэспандэнтаў рускай нацыянальнасці і 1,5% іншай (літоўцы, славакі і г.д.). У якасці роднай мовы беларускую назвалі 30,3%, рускую 44,2%, адначасова беларускую і рускую – 24,8%. Адным з пытанняў анкеты было ахарактарызаваць абедзве дзяржаўныя мовы Рэспублікі Беларусь пяццю эпітэтамі. Пры характарыстыцы беларускай мовы самым папулярным эпітэтам стаў прыметнік *прыгожая* (64,9%), за ім ідзе эпітэт *меладычная* (*мілагучная*) – 54,5%, па 22,2% маюць эпітэты *багатая* і *родная*. Студэнты называюць беларускую мову *выразнай* (13,2%), *мяккай* (17,5%), *простай* (12,3%), *гучнай* (11,3%), *цікавай* (15%), *добрай* (9%), *старажытнай* (6%). Адзінкавымі фіксацыямі прадстаўленыя эпітэты тыпу *бацькоўская, вялікая, вясёлая, гістарычная, гуманная, дакладная, даражэйшая, дасканалая, казачная, каларытная, каштоўная, красамоўная, лагодная, лірычная, любімая, плаўная, празрыстая, прыемная, святая, сонечная, спеўная, ўнікальная, цудоўная, чароўная, чыстая, шматкаляровая, шматслоўная, шчырая* і інш. Адзначаны і эпітэты негатыўнага зместу. Частка з іх тычыцца не вельмі актыўнай ступені карыстання мовай: *выміраючая, мала знаёмая, неактуальная, нявыгадная, непапулярная, непатрэбная, угасающая, устарэлая*. Для параўнання самым папулярным эпітэтам для рускай мовы апынуўся таксама *прыгожая (красивый)* (46,7%); *меладычнай (мілагучнай)* мову назвалі 9,5% рэспандэнтаў, *багатай* 37,3%, *распаўсюджанай (распространенной)* – 13,9%, *цікавай* 13,4%. У адрозненні ад беларускай мовы шмат студэнтаў вызначаюць рускую мову як *складаную* (14,4%) і *цяжкую* (15,9%). Эпітэты *вялікая* (13,4%) і *магутная* (*магучая*) (12,4%), відавочна, пацвярджаюць знаёмства навучэнцаў з рускай класікай.

Такім чынам, дадзеныя апытання паказваюць, што студэнты ФТКГ у цэлым станоўча ацэньваюць дзве дзяржаўныя мовы, якія функцыянуюць у краіне.